Юлія Амосава

# «О, Беларусь, мая шыпшына»

## Анлайн-конкурс чытальнікаў да 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі



Галоўны бібліёграф
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Адным з напрамкаў дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з'яўляецца стварэнне віртуальных праектаў, якія садзейнічаюць папулярызацыі творчасці выбітных дзеячаў беларускай культуры. Апошнія два гады бібліятэка актыўна працуе над маштабным праектам «На хвалі часу, у плыні жыцця» да 100-годдзя літаратурнага аб'яднання пісьменнікаў і паэтаў «Маладняк». Праект складаецца з асобных віртуальных раздзелаў, якія прысвечаны юбілеям «маладнякоўцаў» і размешчаны на галоўнай старонцы інтэрнэт-партала бібліятэкі. Так, ужо падрыхтавана 7 раздзелаў: да 110-годдзя В. Маракова і 120-годдзя А. Бабарэкі, да 115-годдзя У. Хадыкі, да 120-годдзя К. Чорнага і У. Дубоўкі, да 115-годдзя Я. Скрыгана і А. Александровіча. Зразумела, што ажыццяўленне такога маштабнага, змястоўнага рэсурсу было б немагчыма сіламі толькі адной установы, таму праект ствараецца з дапамогай чатырох арганізацый – Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і Выдавецкага дома «Звязда» (часопіса «Маладосць»).

Важна адзначыць, што акрамя стварэння саміх раздзелаў, збору матэрыялаў, наладжвання сувязей з рознымі ўстановамі, даследчыкамі, нашчадкамі «маладнякоўцаў», Нацыянальная бібліятэка Беларусі і арганізацыі – партнёры праекта вельмі актыўна займаюцца папулярызацыяй рэсурсу. Адной з апошніх ініцыятыў стала правядзенне анлайн-конкурсу чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», які быў прымеркаваны да 120-годдзя У. Дубоўкі. Ён праходзіў з 1 кастрычніка па 15 лістапада 2020 г. і ладзіўся бібліятэкай сумесна з інфармацыйнымі партнёрамі – часопісамі «Маладосць» і «Бярозка».

Прызнацца, прыемнай нечаканасцю стала для арганізатараў колькасць творчых прац, бо ўсяго было даслана 880 відэа з усёй Беларусі, а таксама з-за мяжы, у прыватнасці з Італіі. Ініцыятыва атрымала шырокі агульнарэспубліканскі і міжнародны рэзананс, пакінула шмат станоўчых водгукаў і выявіла вялікую цікавасць да творчасці У. Дубоўкі сярод шырокіх мас. Сёння кожны чалавек можа азнаёміцца з конкурснымі працамі ў спецыяльна створанай суполцы «О, Беларусь, мая шыпшына» ў сацыяльнай сетцы «Facebook», а таксама ў аднайменным плэй-лісце на платформе «YouTube».

Вялікая цікавасць да конкурсу і творчасці паэта, высокі мастацкі ўзровень творчых прац удзельнікаў вельмі ўразіў і пакінуў самыя найлепшыя водгукі гледачоў. Варта падкрэсліць, што дасланыя відэа ацэньвалі не толькі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, але і запрошаныя ўдзельнікі праекта, экспертнае журы, у склад якога ўваходзілі І. Багдановіч – беларуская паэтка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, А. Данільчык – беларуская паэтка, перакладчык, кандыдат філалагічных навук і А. Сівохіна – аўтар і выканаўца ўласных песень, рэжысёр, мастацкі кіраўнік народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова». Журы і арганізатары конкурсу вельмі актыўна працавалі, штодзённа праглядалі ўсе відэа, супрацоўнікі бібліятэкі размяшчалі іх у суполцы ў любы перыяд часу (нават позна ўвечары ці ноччу). На працягу лістапада 2020 г. ішлі актыўныя абмеркаванні выступленняў, вызначаліся лідары, збіраліся падабайкі ў конкурснай групе ў сацыяльнай сетцы «Facebook».

Зразумела, што вылучыць лепшых сярод такой колькасці таленавітых і артыстычных удзельнікаў аказалася даволі няпростай задачай, таму арганізатары конкурсу і журы вызначалі пераможцаў у адпаведнасці з узроставымі катэгорыямі: 6–9, 10–13,

14–17 гадоў, а таксама сярод дарослых чытальнікаў ад 18 гадоў.

Конкурс завяршыўся, а ў памяці засталіся яскравыя вобразы, створаныя ўдзельнікамі, прачулае і асэнсаванае чытанне, тэатралізаваныя выступленні, музычныя ўвасабленні вершаў і нейкая іскра шчырасці ў вачах удзельнікаў, якая не можа не закрануць. Хацелася б напісаць амаль пра кожнага маленькага і дарослага чытальніка, выказаць ім сваю ўдзячнасць і павагу, бо ўсе яны стараліся, выбіралі вершы самі ці з настаўнікамі і бацькамі, рыхтавалі відэа, касцюмы і дэкарацыі, хваляваліся наконт вынікаў конкурсу, але вялікая колькасць прац, на жаль, не дазваляе гэтага зрабіць. Таму адзначым толькі частку выступленняў, якія вельмі ўразілі не толькі журы, але і шматлікіх гледачоў.

Сярод пераможцаў у катэгорыі 6–9 гадоў І месца заняла сямігадовая А. Рудэнка з Махаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад – сярэдняя школа Магілёўскага раёна. Яна прадставіла казку У. Дубоўкі «Пра дзеда і ўнука». Нягледзячы на зусім юны ўзрост, гэтая дзяўчынка з асэнсаваннем прачытала даволі доўгі вершаваны тэкст, журы адзначыла чысціню яе мовы, мяккасць вымаўлення, правільна пастаўленыя акцэнты ў сказах, якія дапамаглі данесці ідэю, якую ўклаў у гэты павучальны твор пісьменнік.

Вельмі артыстычнае выступленне, якое таксама ўсе адзначылі, атрымалася ў С. Сашко з Азярцоўскай сярэдняй школы Мінскага раёна. Юны чытальнік выразна, свабодна, з доляй гумару прадэкламаваў верш «Дасціпны певень», што дапамагло яму заняць ІІ месца ў катэгорыі 6–9 гадоў.

Бясспрэчным лідарам конкурсу стала выступленне чатырох вучняў Бараўлянскай гімназіі Мінскага раёна: А. Астаповіча, З. Прыбыша, Р. Сасноўскага і Ц. Жырнага. Хлопцы занялі І месца ў катэгорыі 10–13 гадоў з казкай «Як сінячок да сонца лётаў», вялікім і няпростым для дэкламавання творам. Яны не толькі выразна прачыталі казку, перадаючы словы адзін аднаму, часам уступаючы ў дыялог, але і выдатна абыгралі яе. Так, надзвычай паспяховым і арыгінальным стаў антураж выступлення, бо вучні чыталі твор седзячы ля вогнішча ў лесе.

Пра агонь, яго вынаходніцтва для людзей і птушак і ідзе гаворка ў казцы, таму хлопцам удалося ўзмацніць эфект ад твора, яскрава ажывіць яго перад вачыма гледачоў, а выступленні такога кшталту ўжо не забываюцца.

Моцнае ўражанне пакінула чытанне верша У. Дубоўкі «Хадзілі, таварыш, з табой мы» У. Мурманцавай, вучаніцай гімназіі № 4 г. Мінска. Таленавітая дзяўчына атрымала ІІ месца конкурсу ў катэгорыі 10–13 гадоў. Яе чытанне здзівіла глыбінёй асэнсавання кожнага слова, радка, напісанага паэтам, а гэта ж дужа няпросты верш пра Грамадзянскую вайну, які і не кожны дарослы зможа прачуць.

У катэгорыі 14–17 гадоў заслужанае І месца атрымала Д. Ціханская, якая вучыцца ў сярэдняй школе № 18 г. Барань, а таксама з'яўляецца ўдзельніцай узорнага тэатра «Вясёлка» Палаца культуры Барані. Яна прадставіла журы верш «Пяе дзяўчына над ракою». Дар'я, бясспрэчна, таленавітая і здольная да тэатральнай творчасці, ужо амаль артыстка, бо яна не проста выразна чытае, а выбудоўвае драматургію твора. Гэта моцны выступ, які зроблены на высокамастацкім узроўні.

Прыемна адзначыць, што конкурс выклікаў цікавасць і сярод дарослых удзельнікаў. Так, арганізатары атрымалі больш за 60 творчых прац чытальнікаў ва ўзросце ад 18 да 71 года. Запомніліся выступленні А. Балуш, А. Ананьева, Т. Пісьмянковай, М. Федарука, супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Г. Ціпун, творчыя працы пераможцаў у катэгорыі дарослых М. Мандзік і В. Сакаловай. Прыгожы мастацкі вобраз стварыў у вершы «Дождж у Мазыры» А. Матошка, кіраўнік клуба «Натхненне» пры Расонскім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці, самадзейны паэт, які заваяваў ІІ месца конкурсу. Яму ўдалося не толькі пранікнёна прачытаць верш, але і стварыць гукавое суправаджэнне – «гром Пяруна», дажджу, які паліўся «як цераз сіта». Дарэчы, Аляксандр ужо дасведчаны ўдзельнік і пераможца шматлікіх літаратурных конкурсаў.

Улічваючы вялікую колькасць творчых прац, іх высокі мастацкі ўзровень, арганізатары конкурсу не змаглі абысці ўвагай і іншыя выступленні, якія хоць і не сталі пераможцамі, але пакінулі моцнае ўражанне, сталі незабыўнымі. Некаторыя відэа нават было жаданне пераглядаць, вяртацца да іх зноў і зноў. Каб адзначыць шэраг яскравых выступленняў, звярнуць на іх увагу і падтрымаць найбольш таленавітых, арганізатарамі былі прыдуманы намінацыі па розных крытэрыях, дзе журы вылучала ад адной да чатырох прац. Напрыклад, прыемнай нечаканасцю сталі пяцігадовыя ўдзельнікі, таму была створана намінацыя «Лепшы з самых маленькіх чытальнікаў», у якой перамагла Л. Катлярова, выхаванка дзіцячага садка в. Разанцы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Здзівіла, што маленькая дзяўчынка змагла вывучыць і прачытаць па-беларуску такі складаны для яе ўзросту

верш «Родная мова, цудоўная мова».

Адпаведна была створана намінацыя «Самы сталы чытальнік», дзе была адзначана Л. Круглік, удзельніца народнага літаратурнага клуба «Выток» Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, якая прадставіла верш «Залатая, асенняя раніца».

Вядома, што творчыя конкурсы – рэч даволі суб'ектыўная, у кожнага свае ўяўленні, любімая манера выканання, свой густ, свае перавагі, але ўсе члены журы і арганізатары конкурсу адзначылі яскравае выступленне І. Байкова, удзельніка ўзорнага тэатра «Вясёлка» Палаца культуры г. Барань з вершам «Партызанскі баян». Яго чытанне натхніла на стварэнне намінацыі «Сапраўдны артыст», у якой юнак стаў адзіным пераможцам. Шчыра спадзяёмся, што ў будучыні яшчэ ўбачым Івана на тэатральнай сцэне і на кінаэкране.

Вельмі прыемна, што большасць удзельнікаў творча падышлі да чытання вершаў і асабліва казак У. Дубоўкі і падрыхтавалі цэлыя мініспектаклі! Такія выступленні немагчыма было не адзначыць, таму былі створаны намінацыі «За лепшую тэатралізацыю» і «Тэатр аднаго акцёра». Так, уразілі працы Д. Якунінай («Як лісіца збанок тапіла»), А. Барабаша (казка «Пра дзеда і ўнука»), М. Бондаравай (казка «Срэбраны званочак») і іншых удзельнікаў.

Мілагучныя вершы У. Дубоўкі неаднаразова прыцягвалі ўвагу беларускіх кампазітараў: М. Равенскага, А. Багатырова, Л. Абеліёвіча, М. Куліковіча і інш. Вабяць яны і нашых сучаснікаў, удзельнікаў конкурсу. Напрыклад, Л. Фёдарава з Наваполацка падрыхтвала песню ўласнага сачынення на верш «О, Беларусь, мая шыпшына», а Т. Аржаноўская, навучэнка Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа імя Л. Выгоцкага паклала на музыку верш У. Дубоўкі «Пяе дзяўчына над ракою». Удзельніцы былі адзначаны ў намінацыі «За лепшае музычнае ўвасабленне верша».

Некаторыя вобразы, створаныя чытальнікамі, былі настолькі кранальнымі, незвычайнымі, яскравымі, што надоўга засталіся ў памяці, яны ўсплываюць самі сабой толькі пры згадванні прозвішча ўдзельніка. У сувязі з гэтым была створана намінацыя «Незабыўны вобраз», у якой адной з лепшых стала Г. Маркава, вучаніца сярэдняй школы № 35 г. Магілёва з вершам «Песня, ушчунь!». Сярод пераможцаў у гэтай жа намінацыі немагчыма было не адзначыць васьмігадовага вучня Разанцаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад – сярэдняя школа Мсціслаўскага раёна Л. Надтачэева, які стварыў сапраўды незабыўны вобраз партызана (верш «Голас партызана»), а відэа і музычны фон толькі ўзмацнілі ўражанне.

Былі і іншыя намінацыі: «За чысціню літаратурнай мовы», «За эмацыянальнасць і артыстызм», «За душэўнасць і пранікнёнасць», «За шчырасць», «За абаяльнасць і харызматычнасць», «За выразнасць чытання», «За нестандартны падыход», «За лепшае афармленне выступу». Сярод пераможцаў у гэтых намінацыях запомніўся артыстычны Д. Лакей (казка «Хто дужэйшы»), эмацыянальная і жывая М. Стрыевіч (верш «Ведаю, што і я памру, як і ўсе»), абаяльная В. Пяцько (казка «Сквапныя мядзведзікі»), шчырая В. Рыжыкава (верш «Думкі лятуць»), творчая М. Шабуня (верш «Не трэба мне пяяць на Беларусі») і многія іншыя, бо пералічыць усіх немагчыма.

Сярод выбраных удзельнікамі твораў У. Дубоўкі найбольшую колькасць склалі чытанні вершаў «Родная мова, цудоўная мова», «О, Беларусь, мая шыпшына», «Залатая, асенняя раніца», «Пальцы жоўтых, кляновых лістоў» і казка «Пра дзеда і ўнука». Лепшымі ў прачытанні гэтых твораў сталі С. Празднова, Г. Радзевіч, Н. Багдзевіч, Л. Мельнікава, А. Мініч і інш.

Прыз глядацкіх сімпатый (за найбольшую колькасць падабаек у конкурснай групе ў сацыяльнай сетцы «Facebook») за казку «Пра дзеда і ўнука» атрымалі І. Скарабагатаў і Э. Рогалева з Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі. Гэты выступ стаў сукупнасцю выразнага чытання, тэатралізацыі і арыгінальнага афармлення. Маленькія чытальнікі быццам перанеслі гледачоў у казачную атмасферу: былі падабраны дэкарацыі і касцюмы, а само выступленне афармлена ў выглядзе кнігі, старонкі якой гарталіся адпаведна зместу казкі.

Акрамя гэтага, часопіс «Маладосць», інфармацыйны партнёр конкурсу, вызначыў свой прыз сімпатый, які атрымалі А. Колесава і Я. Кузаўкоў, а лепшымі, на думку народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова», сталі Я. Шчэрбаў і Т. Новікава (намінацыя «За жывое слова»).

Такім чынам, анлайн-конкурс «О, Беларусь, мая шыпшына!» да 120-годдзя У. Дубоўкі пацвердзіў неабходнасць і запатрабаванасць грамадства ў такіх унікальных праектах і паказаў здольнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да арганізацыі мерапрыемстваў у сучасных фарматах.

Summary

The article summarizes the results of the online competition "Oh, Belarus, my rosehip", timed to coincide with the 120th anniversary of Vladimir Dubovka.

# У публічных бібліятэках

*Библиотека в виртуальном пространстве. Матэрыял чытайце на с. 13–16*




# І нфармацыйныя рэсурсы








*«О, Беларусь, мая Шыпшына»: анлайн-конкурс чытальнікаў да 120-годдзя Уладзіміра Дубоўкі. Матэрыял чытайце на с. 22–24*